Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 40 (633). Wilnia, Niadziela 3 Listapada 1935 h. Hod XI (XIX)

MOKSLŲ AKADEMIJOS BIBLIOTEKA

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Rym daloka—Boh wysoka...

Našu redakcyju adwiedaŭ niadaŭna haduniec Wilenskaj Katalickaj Duchoŭnaj Seminaryi student W. Papucewič, jakoha seminaryjnyja ŭłady z seminaryi wydalili. Pryčyna wydaleńnia, apryča ahulnaha ćwierdžańnia, što jon „niema powołania do stanu duchownego", nie pakazana nijakaja. Sam Papucewič nijakich ani prawinaŭ, ani prastupkaŭ za saboj nia čuje, wučyŭsia dobra i, jak sam kaža, zusim ščyra chacieŭ stacca ksiandzom. Ale Papucewič świedamy i aktyŭny biełarus i jon prakanany, što imienna biełaruskaść i była pryčynaj „niastačy powołania" i wydaleńnia jaho z seminaryi. Moža adnak wydaleny seminaryst heny mylajecca? Moža być. Ale wiedajučy nastroj da biełaruskaha adradženskaha ruchu kiraŭnictwa Seminaryi, tak-ža nadta mahčyma, što seminaryst heny nia mylajecca.

Zdareńnie z Papucewičam, a tak-ža charakterystyka adnosinaŭ kiraŭnictwa Wilenskaj Duch. Seminaryi da klerykaŭ biełarusaŭ i litoŭcaŭ, padanyja nami na padstawie „Viln. Rytojus" u minułym numary „Bieł. Krynicy", — zmušajuć nas zahawaryć u hetaj sprawie šyrej i pryncypowa.

Budziem hawaryć ab Wilenskaj Duch. Seminaryi i ab Pinskaj. Wializarnaja bolšaść katalikoŭ hetych dźwioch dyecezijaŭ—heta biełarusy. U Wilenskaj archidyecezii ŭsich katalikoŭ pawodle sioletnich aficyjalnych dadzienych—1.409.740. Z hetaj ličby jakich tysiač bolš 200 litoŭcy (litoŭcaŭ u wa ŭsiej Polščy, pawodle litoŭskaj statystyki, naličajecca da 300 tys.), niaznačny pracent palaki, a rešta biełarusy. U dyecezii Pinskaj pawodle aficyjalnaha śpisu z 1934 usich katalikoŭ 286.252. Z hetaj ličby niaznačny pracent palaki, a rešta biełarusy. Takim čynam usich katalikoŭ u Wilenskaj i Pinskaj dyecezijach bolš miljona.

Pakazčykam relihijnaha žyćcia hetych biełarusaŭ katalikoŭ i adnosinaŭ da ich relihijnych patrebaŭ duchoŭnych dyecezijalnych uładaŭ słužać pradusim duchoŭnyja seminaryi.

Čaho-ž patrebnaha dla narmalnaha raźwićcia relihijnaha žyćcia biełarusaŭ katalikoŭ niama ŭ duchoŭnych seminaryjach u Wilni i ŭ Pinsku? Niama pradmietu biełaruskaj mowy, nie haworačy ŭžo ab historyi Biełarusi i ab historyi biełaruskaj litaratury. Niama tam tak-ža prafesaroŭ biełarusaŭ. U Wilenskaj seminaryi ŭžo musić hadoŭ tamu dziesiatak byŭ prafesaram biełarus ks. dr. J. Rešeć. U Pinskaj paru hadoŭ tamu byŭ prafesaram biełarus ks. dr. K. Kułak. Abodwych ich spatkaŭ los uspomnienaha... kleryka Papucewiča.

A što-ž jość u henych seminaryjach? Polski nacyjanalistyčny duch, palaki prafesary pierawažna polskija nacyjanalisty i ŭrešcie ŭ bolšaści kleryki palaki z ziamiel etnohrafična polskich. Nastroj u hetych abiedźwiuch seminaryjach polskaj wyklučnaści staić na pieraškodzie pastupać u ich biełarusam i litoŭcam.

Woś jakaja „katalickaja" palityka panuje ŭ duchoŭnych katalickich seminaryjach na našych ziemlach! Kali-ž da hetaha dadadziom fakt, što biskupy Wilenskaj i Pinskaj dyecezii ahułam nie dapuskajuć biełaruskich kazańniaŭ, pakasawali, dzie takija byli, i što tych biełarusaŭ ksiandzoŭ, jakija niejkim „cudam" nad Wilijaj i nad Pinaj zmahli astacca ksiandzami, naznačali u parafii nie biełaruskija (prykładam: ks. Rešeć, Šutowič, Lewoš i inš. u Wilenskaj archidyecezii, ks. Tatarynowič i inš. u Pinskaj dyecezii), — dyk budziem mieć bolš-mienš poŭny abraz ichnaj „katalickaści".

Ale heta dla nas nie nawina. Heta ŭžo staraja, daŭno wiedamaja reč i niama tut čaho ab hetym šmat hawaryć. Užo wialiki čas biełarusam katalikom ad hutarak pierajšci da dzieła.

Treba pradusim trymacca Kaścioła, Wiery, Boha i pracawać dziela zdabyćcia naležnych sabie prawoŭ u relihijnym žyćci, choć mnohija daradžajuć stacca biazbožnikami.

Treba čaściej infarmawać ab pałažeńni ŭ Wilenskaj i Pinskaj dyecezijach Apostalskuju Stalicu praz Nuncyja ŭ Waršawie, choć... Rym daloka. Treba zwaračwacca čaściej da biskupaŭ miascowych z padańniami ab biełaruskaj katalickaj sprawie, choć jany palaki i, jak pakazwaje praktyka, sprawiadliwymi da nas być nia chočuć. Treba biełaruskuju katalickuju moładź kirawać u duchoŭnyja seminaryi ŭ Wilni i ŭ Pinsku, nia hledziačy na hena hustoje sita, praz jakoje biełarusaŭ tam pierasiawajuć. Treba bolš wypiswać, kuplać, čytać i pašyrać biełaruskaje katalickaje drukawanaje słowa, kab choć hetym zastupić tyja niedachopy, jakija my spatykajem u biełaruskim katalickim žyćci, a na jakija katalickija biskupy ślapyja i hłuchija. Treba nie saromicca swajej biełaruskaj mowy ŭ hutarcy z ksiandzami. Treba tym ksiandzom, jakija jaŭna panižajuć i kryŭdziać usio biełaruskaje pa našych siołach i miastečkach nie dawać nijakich achwiar ani naturaj, ani hrašmi.

Słowam, dziela abarony naležnych sabie prawoŭ u relihijnym žyćci biełarusy kataliki pawinny wykarystać usie mahčymaści, ale pradusim pawinny źwiarnuć u hetym swaju ŭwahu na siabie samych — na swaju świedamaść, stojkaść, arhanizawanaść, bo, jak kaža pahaworka, Rym daloka—Boh wysoka...

Nowaje na stary ład

(Ab ekanamična-haspadarčym žyćci ŭ Polščy).

Ekanamična-haspadarčaje žyćcio ŭ našym Kraju amal zusim zaležnaje ad polskaj haspadarčaj palityki. Za sučasny ekanamična-haspadarčy stan našaha Kraju źjaŭlajecca adkaznym polskaje kiraŭnictwa haspadarčaj palitykaj i ahułam kiraŭnictwa Polščaj — polskaja dziaržaŭnaja ŭłada.

Pałažeńnie našaha sialanstwa wiedamaje. Ab sučasnym žyćci i ab ekanamična-haspadarčym pałažeńni ŭ našym Kraju my nia mała pisali (sioleta padali ahlad hetaj haliny žyćcia ŭžo ŭ 13-caci artykułach pad zahałoŭkam *„Сучаснае палажэньне беларускай вёскі"*, pisali tak-ža asobna ab polskaj haspadarčaj palitycy ŭ našym Kraju.)

Dziela taho, što haspadarčaje žyćcio ŭ našym Kraju ciapier amal zusim zaležnaje ad polskaj ekanamična-haspadarčaj palityki, zahlaniem ŭ centralnaje kiraŭnictwa hetaj palitykaj.

Ciapier usia polskaja presa piša ab ciažkim ekanamična-haspadarčym pałažeńni ŭ Polščy, a polskija ekanamisty i kiraŭniki haspadarčaj palityki šukajuć wychadu z hroznaha sučasnaha ekanamična-haspadarčaha pałažeńnia.

Sučasnaje pałažeńnie pracoŭnych u Polščy — sialan, rabotnikaŭ i pracoŭnaj intelihiencyi,— niepakoić i kiraŭnikoŭ polskaj dziaržawy.

Ab hroznaści ekanamična-haspadarčaha pałažeńnia ŭ Polščy zahawaryŭ aficyjalna polski ŭrad — premjer Kaściałkoŭski i ministr skarbu Kwiatkoŭski.

Z pramowy premjera Kaściałkoŭskaha.

Premjer Kaściałkoŭski, na pasiedžańni Sojmu dnia 24.X.1935 h., abasnoŭwajučy pierad Sojmam ŭradawy prajekt poŭnamoctwaŭ dla Prezydenta respubliki wydawać dekrety ŭ sprawie naprawy sučasnaha haspadarčaha pałažeńnia ŭ dziaržawie, miž inšym skazaŭ nastupnaje.

...Znachodzimsia ŭ tym časie, u jakim žyćcio šukaje nowych daroh i nowaj raźwiazki...

Pracoŭnaje hramadzianstwa staraje, mučanaje stracham utraty pracy, a maładyja elementy nia mohuć raźwiwać swajej mahčymaści. Hetkaje pałažeńnie rodzić kryzys psychičny, jaki jość hraźniejšy za kryzys haspadarčy... Starańni zabiaśpiečańnia štodziennaha chleba nia tolki siarod „starych", ale tak-ža i siarod „moładzi" zasłaniajuć najważniejšyja sprawy — i ŭ hetym jość najbolšaja niebiaśpieka...

Nia maju namiareńnia šyryć biezpadstaŭnaha optymizmu. Z paŭnatoj świedamaści i adkaznaści mušu ścwierdzić, što našaje pałažeńnie jość ciažkoje... Pieramahčy hety ciažar, zraŭniać apaźnieńnie ŭ paraŭnańni da zachodnich krain, źbić wastryjo ŭbostwa, možam tolki wytrywałaj, uporystaj pracaj, wialikimi i biesprarыŭnymi natuhami"...

Hetak haworyć ab sučasnym ekanamična-haspadarčym pałažeńni ŭ Polščy staršynia polskaha ŭradu i šukajučy z jaho wychadu padaje prahramu, jak urad maje papraŭlać henaje pałažeńnie. ...„Dziaržaŭny budžet musić być zroŭnaważany" — zajaŭlaje premjer Kaściałkoŭski — h. zn. na raschody pawinny być sumy dziela ich pakryćcia. Pry hetym premjer Kaściałkoŭski z naciskam padčyrknuŭ, što roŭnawaha budžetu i stałaść hrašej — heta nieparušnyja pryncypy polskaj haspadarčaj palityki.

Haworačy ab sposabach zroŭnaważańnia budžetu, ab wojsku premjer skazaŭ hetak:

...„urad budzie staracca z usiaje mahčymaści, kab našaje wojska atrymała ŭsio, što jamu patrebnaje dziela wykanańnia swajho zadańnia — abarony całaści dziaržawy".

Miž inšym, premjer uradu wykazaŭ, što ŭrad maje namier pierabudoŭwać ziemlarobstwa ŭ Polščy, šlacham dalejšaha prawodžańnia užo pačataj pierabudowy ziemlarobstwa.

Roŭnaważyć dziaržaŭny budžet urad budzie reformaj „dachodnaha padatku", nadzwyčajnym padatkam ad pensijaŭ i aščadnaściami.

Apryča hetaha, premjer Kaściałkoŭski zajawiŭ:

„Chočam pałažyć nacisk na źnižku koštaŭ pražyćcia...

Abnizim na pałowinu samaŭradawy padatak dadatku da ziamielnaha padatku; zabaronim brać apłaty za ŭjezd u miesty i na rynki... abnizim canu pierawozu tawaraŭ čyhunkaj".

Hetak, mienš-bolš, pradstaŭlajecca prahrama paprawy ekanamična-haspadarčaha pałažeńnia ŭ Polščy.

Z pramowy ministra skarbu Kwiatkoŭskaha.

Paśla pramowy premjera Kaściałkoŭskaha ŭ Sojmie skazaŭ tak-ža prahramowuju pramowu ab polskaj ekanamična-haspadarčaj palitycy i ministr skarbu Kwiatkoŭski.

Z hetaj pramowy dawiedywajemsia, jak budzie prawodzicca ŭ žyćcio padanaja staršyniaj uradu prahrama zroŭnaważańnia dziaržaŭnaha budžetu, jakimi sposabami i čyim koštam.

Ministr zanalizawaŭšy nizki roŭwień polskaj dziaržaŭnaj haspadarki zajaŭlaje, što na padmohu zahraničnych kapitałaŭ nie nadziejecca, adnak dewaluacyi ani inflacyi ŭrad prawodzić nia budzie.

2403

Haworačy ab dziaržaŭnym budžecie miž inšym skazaŭ hetak:

...„ad 1930-31 budžetnaha hodu dachody apadali i dziela hetaha stała ŭzrastaŭ, kožny hod bolšy, u dziaržaŭnym skarbie deficyt — niedabor... Hety deficyt urad musiŭ pakrywać pazyčkami... Kali nie paŭstrymajem razhonu deficytu, to da kanca h. h. deficyt dasiahnie jašče bolšaj sumy — dadatkowa kala 130 miljonaŭ".

Paŭstrymać i skasawać hety deficyt dziaržaŭnaha skarbu ūrad maje nowymi padatkami —

palmienna:

1) padatkam nadzwyčajnym ad pensijaŭ u raźmiery prahresyŭnym ad 7 da 20 pracentaŭ;

2) reformaj „dachodnaha padatku", jakaja maje pałahać na abniżeńni apadatkawańnia dachodnaści ad 1200 zł.;

3) ustanaŭleńniem kryzyzowaha dadatku da dziaržaŭnaha „dachodnaha padatku.

Apracza hetaha, urad maje namier zrabić pierahlad emyryturaŭ, spynić wydatki na niekatoryja inwestycyi i prawieści redukcyju čynoŭnikaŭ, tam, dzie adnačasna atrymliwajuć skarbowyja hrošy muž i žonka.

Ministr skarbu z usiej pawahaj zajawiŭ, **što nijakaj redukcyi padatkaŭ nia budzie.**

* * *

Kab acanić hetuju prahramu polskaha ŭradu, u sprawie dalejšaj ekanamična-haspadarčaj palityki, z hledziščа intaresaŭ našaha Kraju i našaha narodu, treba zanalizawać, jakimi rusłami henaja prahrama maje prachodzić u našym Kraju.

Pačniom ad najlepšaha i ad najhałaŭniejšaha dla našaha Kraju i našaha narodu.

Kab padniać padatkawuju płatazdolnaść i kab pawysić spažywieckaść u narodzie ŭsialakaj pradukcyi, treba padniać rowień zamožnaści nasielnictwa. A kab da hetkaha roŭnia padniać naš Kraj, treba, naŭpierad, dać pracu wialikaj nidzie nie rejestrawanaj sialanskaj biezrabotnaj armii — treba dać biezrabotnamu biezziamielnamu i małaziamielnamu sialanstwu warštat pracy, — treba prawieści daŭno patrebnuju i doŭha čakanuju sprawiadliwuju ziamielnuju reformu.

Praŭda, premjer uradu skazaŭ i ab pierabudowie ziemlarobstwa. Ale hetaja „pierabudowa" maje być tolki dalejšym prawodžańniem užo pačataj pierabudowy ziemlarobstwa, pierabudowy, jakaja ŭ našym Kraju pałahaje na asadžwańni na „wolnych" ziemlach polskich asadnikaŭ i na chutaryzacyi haspadarak miascowaha sialanstwa, u bolšaści małaziamielnaha, biez pryrezki ziamli dla małaziamielnych. A biezziamielnyja (parabki ŭ dwaroch i inšyja) i dalej astajucca čakajučy „lepšych dla sabie časaŭ".

U piatyja ŭhodki hurtka B.I.H iK

(Juški, kala Tabaryšak, Wil.-Trockaha paw.).

U paławinie wieraśnia sioleta minuła 5 hadoŭ, jak zasnawaŭsia ŭ našaj wioscy hurtok Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury. U piatyja ŭhodki isnawańnia ŭ nas hurtka B.I.H.iK. — 22.IX.35 h. uprawa našaha hurtka ładziła adpawiednuju ŭračystaść, — uračysty schod siabroŭ z učasciem haściej, prychilnikaŭ i sympatykaŭ, na jakim pračytany referat ab Litoŭskim Statucie i jaho značeńni dla Biełarusaŭ, dana sprawazdača z dziejnaści hurtka za 5 hadoŭ; zakončana ŭračystaść śpiewam chorom biełaruskich pieśniaŭ.

Na schod zyšlisia ludzi ŭ pamieškańnie hurtka BIHiK, jakoje było prybrana biełaruskimi narodnymi bielčyrwona-biełymi ściahami, a na pawažnym miejscy wisieła na ścianie pobač z ściahami našaja Pahonia. Uračystaść pačałasia a 3 hadzinie papaŭdni.

Ustupnaje słowa, adkrywajučy ŭračysty schod, skazaŭ staršynia hurtka; jonža pračytaŭ i referat ab Litoŭskim Statucie.

Sprawazdaču z dziejnaści hurtka daŭ siabra uprawy J Dulka. Z hetaj sprawazdačy dziejnaść hurtka BIHiK. u Juškoch pradstaŭlajecca hetak:

Załadčykami hurtka byli 3 asoby i jany stanawili pieršy ŭrad našaha hurtka: M. Kitkoŭski — staršynia, J. Fiedarowič — skarbnik, M. Jarmałkowič — sekretar. Ciapier naš hurtok składajecca z 20 dziejnych siabroŭ i maje šmat sympatykaŭ i prychilnikaŭ.

U pieršym hodzie swajej pracy hurtok naš zładziŭ adno biełaruskaje pradstaŭleńnie, ładziŭ śpieŭ choram biełaruskich pieśniaŭ i ładziŭ deklamacyi biełaruskich wieršaŭ. Ahułam biełaruskich pradstaŭleńniaŭ hurtok zładziŭ 2, a 2 nie adbylisia z niezależnych ad hurtka pryčyn.

Hurtok naš maje biblijateku-čytalniu, z jakoj karystała dasiul 125 asob i pračytana 560 knižak.

Siabry hurtka majuć i nosiać značok Biel. Inst. Hasp. i Kultury.

U našym hurtku adbylisia dwa referaty, jakija pračytany byli staršyniej Centrali BIHiK. ks. W. Hadleŭskim i wice-staršyniej inž. A. Klimowičam.

U dzień narodnaha šwiata — 25 sakawika, sioleta była zborka siabroŭ i prychilnikaŭ, na jakoj čytali supolna artykuły ŭ hazetach i raskazy ab abwieščeńni niezaležnaści Biełarusi ŭ 1918 h.

Supolnaje čytańnie hazet i knižak u našym hurtku adbywałasia časta.

Siabry našaha hurtka aktyŭna supracoŭničali z susiednimi hurtkami BIHiK. — u Kiejpunach i Mur.-Aśmiancy; tam pamahali ładzić referaty i pradstaŭleńni.

Dziejnaść našaha hurtka abymała i halinu relihijnaha žyćcia — imienna prajaŭlałasia pašyreńniem ŭ narodzie biełaruskich malitaŭnikaŭ „Boh z nami", „Hołas dušy" i inš.

Ahulnych schodaŭ siabroŭ hurtka adbyłosia 6 za piać hadoŭ, a pasiedžańniaŭ uprawy hurtka było 8.

Siabroŭskich składak sabrana 74 zł. i 85 hr.

Na hetym aficyjalnaja časć hetaj uračystaści była zakončana. Paśla hetaha moładź pačała śpiawać „My wyjdziem ščylnymi radami" i „My bojkaja moładź." Pa zakančeńni śpiewu schod razyšoŭsia.

Pry hetym treba adznačyć, što warunki pracy našaha hurtka nadta błahija. U sutanach polskaj endecyi dziejnaść u našych wakolicach nadta ahresyŭnaja. Polonizacyjnuju dziejnaść duchoŭnyja endeki prawodziać tut pad widam h. zw. „katalickaj akcyi" i ahułam relihijnym žyćciom našych ludziej kirujuć wykľučna papolsku.

U našych wakolicach usie kataliki—prawasłaŭnych niama, dyk duchoŭnyja endeki nazywajuć našych ludziej palakami, a nacyjanalna niaświedomyja sialanie dasiul im wieryli i katalictwa nazywali „polskaj wiery."

Ciapier užo pačaŭsia praces uświedamleńnia nacyjanalnaha i relihijnaha. Užo mnohija adkryta i duchoŭnym endekam zajaŭlajuć, što „polskaj wiery" niama, a jany kataliki-biełarusy, ale nie palaki.

Juškoŭski.

Z dalejšych punktaŭ uradawaj prahramy my tak-ža nia bačym palohki dla biełaruskaha sialanstwa, za wyniatkam adnaho — skasawańnia apłaty za ŭjezd u miesty i na rynki, a tak-ža abniżki samaŭradawaha dadatku da ziamielnaha padatku. Ale-ž hetа nia istotnaja paprawa sučasnaha socyjalna-ekanamičnaha bytu našaha sialanstwa — heta tolki pałohka dla jahonaj niepłatazdolnaści padatku.

Słowam, heta „nowaje, u wierchoch polskaj unutranaj palityki, u našym Kraju pojdzie starym ładam.

Pry hetym, my adznačajem, što u našym Kraju pierabudowa ekanamična-haspadarčaha ładu nieabchodnaja. A naŭpierad patrebnaja pierabudowa ziemlarobstwa — patrebnaja hruntoŭnaja zamielnaja reforma, jakoj-by skasawaŭsia wiaskowy-sialanski praletaryjat i ŭzwialičyŭsia lik poŭnaziamielnych haspadaroŭ.

p—k.

БЕЛАРУСЫ! Прысылайце ахвяры на фонд беларускай асьветы!— Пашырайце беларускае друкаванае слова. — Навучайце дзяцей чытаць і пісаць пабеларуску!

З царкоўнага пагосту

Бліжэй да народу.

Віленскі архіепіскап Хвядос, 7 кастрычніка 1935 г. у справе навучаньня рэлігіі праваслаўных дзяцей ў школах на тэрыторыі віленскай эпархіі, выдаў загад гэткага зьместу:

„Віленскай Духоўнай Кансысторыі

З перапіскі па законавучыцельскім справам я бачу, што некаторыя а. а. законавучыцелі ў прыходах з беларускім насяленьнем не выкладаюць у школах Закон Божы на мясцовай матчынай мове, гэта значыць беларускай, з якой прычыны паўстае незадаваленьне з боку адміністрацыі школ і часткі насяленьня і паўстае перапіска шкодная для справы і для самых законавучыцялёў.

Прадпісваю духавенству дакладна выпаўняць загад аб выкладаньні Закону Божага ў школах на матчынай мове, а дзеля таго ў прыходах з беларускім насяленьнем — выкладаць Закон Божы на мове беларускай.

(—) *Архіепіскап Феодосі"*

Гэты загад архіепіскапа, дасьць праўную падставу і магчымасьць для тых сьвяшчэньнікаў, што хочуць працаваць для дабра Царквы і беларускага народу, блізка падыйсьці да беларускіх дзяцей, каб пазнаёміць іх з аснаўнымі панякцямі хрысьціянства.

Гэты загад узмацняе так-жа і падставу дзеля трэбаваньня з боку бацькоў і душпастыраў навучаньня беларускіх дзяцей у школах праваслаўнай рэлігіі пабеларуску.

Апрача гэтага, віленская праваслаўная кансысторыя выдала пастанову, каб пропаведзі ў цэрквах віленскай эпархіі гаварылі прапаведнікі пабеларуску.

Бязсумліўна гэты архіепіскапскі загад і кансысторская пастанова ў нашым царкоўна-народным жыцьці маюць вялікае значэньне. І мы спадзяемся, што яны будуць прыкладам і для другіх праваслаўных эпархіяў на этнографічных беларускіх землях — для эпархіяў горадзенскай і пінскай.

Але пасьля гэтага загаду і пастановы трэба добрай волі і хрысьціянскай справядлівасьці ў выкананьні гэтага дзела.

Гэткага выканьня вымагае паважнасьць справы, гэтага чакаюць і праваслаўныя беларусы.

Сідарчук.

Чытайце і пашырайце адзіны беларускі гаспадарскі часапіс „САМАПОМАЧ"! Пробныя нумары высылаюцца бясплатна. Адрас: Red. „Samapomač", Wilnia — Wilno, Połackaja Nr. 9—4

Dr. Stanisłaŭ Hrynkiewič.

Aświeta.

(Ab Narodnym Uniwersytecie i inšych sposabach aświetnaje pracy). I

Kožnaja para ŭ žyćci adzinki i hramady c narodu maje roznyja peryjady, maje swaje hierojskija časiny, nastroi. Ščaśliwyja tyja, što ŭmieli ŭjawić i zachapicca mahčymaściami, u jakich pracujuć i zmahajucca, jakija nie zahubili wiery i nadziei ŭ budučynu, što nia hledziačy na ŭsie nie hadzi kala ich, žywuć dziela praŭdy i krasy... Nia lohka heta, dy treba sabie jasna skazać, što niama ničoha lohkaha ŭ žyćci, što žyćcio samo, kali na jaho hladzieć sa starany natuhi patrebnaje, kab prosta taki tolki pražyć, moža dawiaści da adčaju. Adnak, chaj tolki čałaviek nawokał siabie hlanie, chaj adpačynie na časinu ad źniamohi, ad biedaŭ, rastrusak, dyk biezadkładna nojdzie toje sapraŭdnaje charastwo, dziela jakoha paklikany jon i ŭsio žywoje.

Biazumoŭna našyja ŭmowy biełaruskija nie spahadajuć zašmat radaści. Naadwarot, kožnaja halina, kožny zahon pakazwaje nam hetulki biedaŭ, hetulki niehadziaŭ, što sapraŭdy ruki mohuć zawianuć i sum moh-by abtulić nas ščylna.

I jasna, što wysnawak byŭ-by niaprawilny. Našaja budučynia pierad nami. My wykujem jaje rukami i sučasnaść treba nam mieryć mahčymaściami budučyni a nia tym, što siańnia majema.

Adnoju z najbolš ciomnych staron našaha sučasnaha žyćcia — heta sprawa aświety hušča na rodnaha. Da wajny było błaha, škołaŭ było mała, škoły byli siarednije jakaści, u škole dziaŭčyna najbolš kali mahli nawučycca čytać ci pisać. Biazumoŭna, umiectwa čytać i pisać wielmi ważnaje, jano daje nam mahčymaść karystać samastojna z bahaćciaŭ, zapisanych u knižkach i pakinutych u spadčynie pakaleńniami, jakija ŭžo adyšli.

Na žal aświeta kančałasia na pačatkawaj škole i wielmi časta ŭsia karyść sa škoły była taja, što čałaviek moh pračytać zahady administracyjnaje ŭłady, moh pamalicca z knižki ŭ kaściele dy padpisacca na papierach, kali jamu užo dawiałosia niedzie padpisywacca. Nia było ŭ dawajennaje biełaruskaj, — ci lepš kažučy — škole na biełaruskaj terytoryi, nijakich umowaŭ dziela pracy kulturnaje, nia było mo' adnačasna j taho zacikaŭleńnia, jakoje biazumoŭna nadta patrebnaje dziela bujniejšaha razwoju ŭnutranych cennaściaŭ adzinki na asnowiedzi kulturnaje pracy.

Paślawajennyja ŭmowy, jakija ahułam, nia hledziačy na ŭsio błahoje, pieramianili šmat čaho na karyść, małuju pieramienu dali ŭ halinie aświety. Možna nat' kazać, što z boku hledžeńnia nacyjanalnaha biełaruskaha, aświeta paśla wajny, pryniamsia aświeta aficyjalnaja, kali i pieramianiłasia, dyk u šmat čym na horšaje. Była jana i da wajny u čužoj mowie, dawajenny nastaŭnik byŭ bolš ci mienš idejnym, ci tolki prosta maleńkim ŭradoŭcam rasiejskim, a siańnia dyk mała kab nastaŭnik polskaje škoły ŭ nas byŭ dobrym adumysłoŭcam, kab wučyŭ samaje hramaty, jon siańnia „paklikany" da dziaržaŭnaje pracy, kab sa školnikaŭ wyhadawać ludziej inšych, čymsia ichnija baćki, wiaściej ci nia tolki pa linii łojalnaści da dziaržawy a kab jany wyraśli na palakoŭ.

Nia treba kazać, jakija pakidaje heta śliedzi pa sabie na maładych dušach.

Adno, što nia majuć dzieci siańnia biezapelacyjna pryniataha pryncypu, što škoła nawučać mowie tolki ŭ rodnaj mowie, a jašče horš, ad samaha rańniaha dziectwa dzieci nakiroŭwajecca na fałšywy šlach...

— Dobra! — moža kazać niechta. — Niewialikija śledamki pakidaje henaja rabota pakulšto. Usie natuhi prapadajuć niedzie biaz śledu i žyćcio jdzie samo saboju, nie zakranuŭšy hłybiej dušy biełaruskaje...

Kali-b i tak, dyk sapraŭdy sumnaja pałohkal..

Nia majem, značycca, swaje rodnaje aświety najniżejšaje stupieni, nia majem swaje rodnaje siarednaje škoły, dy ahułam nijakaje školnaje aświetnaje placoŭki. Nia majem kaścioła, carkwy, jak heta bywała časta ŭ inšych narodaŭ, dzie ŭ światyniach była adzinaja krynica nacyjanalnaha žyćcia.

U halinie aświety zahnany my bolš, jak dzie niechta druhi. Da taho-ž uziać jašče našuju sapraŭdnaść, našuju halitu, zahnanaść našaje intelihiencyi!

Masy narodnyja i pawadyry žyćcia masaŭ razumieli dobra henaje niemčymaje, nienarmalnaje źjawišča i dziela taho bačym užo daŭno sproby naładzić biełaruskuju zaškolnuju aświetu. I jakija chto maje ci mieŭ-by zaściarohi da ŭstanowaŭ Tawarystwa Biełaruskaje Škoły ci Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury" ci jašče jakich inšych, što pracawali na terytoryi Zachodnije Biełarusi, dyk wartaść ich wialikaja, što jany źwiarnulisia na šlach budaŭnictwa kultury na tych płatformach, jakija nam jašče astalisia mahčymyja. Abiedźwie z pamianionych ustanowaŭ majuć mety šmat šyrejšyja, imknucca jany da taho, kab abniać sucelnaść žyćcia nacyjanalnaha, u jahonych patrebach duchowych. Pa mahčymaści kožnaja

Z Sojmu i Senatu.

(Haspadarčaja dyktatura).

Ciapierašniaja nadzwyčajnaja sesija polskaha Sojmu sklikana specyjalna dziela pryznańnia Prezydentu respubliki poūnamoctwa da dnia 15 studzienia 1936 h. wydawać dekrety ū sprawach haspadarčych i finansawych, apračа źmieny rasparadžeńnia Prezydenta z 13.X.1927 h. ab stabilizacyi złotaha.

Na hetaj sesii ūrad padaū prajekt hetaha paūnamoctwa i abasnawaū jaho haspadarčaj prahramaj, wykazanaj u pramowie premjera Kaściałkoūskaha i min. skarbu Kwiatkoūskaha.

Sojm uradawy prajekt pryniaū i hetym samym daū Prezydentu poūnamoctwa.

Sklikany na narady tak-ža i Senat, jaki ū paradku farmalnym razhledzić prajekt poūnamoctwa Prezydentu i jaho paćwierdzić.

Słowam, urad budzie mieć haspadarčuju dyktaturu.

Z wajennaha frontu.

Z Afryki prychodziać wiestki, što ciapier na wajennym froncie miž wojskam abisynskim i italijanskim adbywajucca tolki niewialikija pierastrełki. Z abiedźwiuch staron — italijancy i abisyncy hatowiacca da wialikaj bitwy.

Ciapier užo nia tak lohka, jak było śpiarša, italijancam udajecca zabirać abisynskuju terytoryju, — abisyncy ūžo zarhanizawalisia i ūmieła ū horach bjuć italijancaū. Abisyncy što-raz macniejuć na froncie, a italijancy — słabiejuć.

Japonska-kitajski dahawor suproć balšawikoū.

Z Dalokaha Uschodu padajuć, što japonskaja ūłada zaprapanawała Kitaju swaju pomač u abaronie Paūnočnaha Kitaju i Siaredniaj Manholii ad balšawizmu. Kitajskija ūłady da hetaj prapazycyi adnieślisia prychilna. Japonskaja ūłada maje namier zaklučyć z Kitajem farmalny dahawor u sprawie utwareńnia supolnaha frontu suproć balšawizmu.

Roznyja wiestki

Z UKRAINSKAHA ŽYĆCIA.

Śmierć wydatnaha ukrainskaha historyka. U Kijewie pamior wiedamy ukrainski wučony Mikoła Wasilenko, siabra Ukrainskaj Akademii Nawuk.

Imia Mikoły Wasilenka nieraździelna źwiazana z historyjaj ukrainskaj kultury; jon, budučy ministram aświety, zaćwierdziū statut Ukrainskaj Akademii Nawuk.

Z POLŠČY.

Hatowiać reformu małačarstwa. Mininisterstwa ziemlarobstwa hatowić prajekt nowaha małačarskaha zakonu. Hety prajekt ū asnowie źmianiaje ūsie dasiulešnija warunki pracy i arhanizacyju małačarskich pradpryjemstwaū usich typaū — prywatnych i kooperatyūnych.

Hałoūnaja źmiena zaklučajecca ū tym, što kantrolu nad usimi małačarskimi pradpryjemstwami buduć wykonywać Ziemlarobskija Pałaty. Hetyja Pałaty buduć dawać i kancesii na małačarskija pradpryjemstwy.

Takim čynam, zhodna z hetym zakonaprajektam, źlikwidujecca hramadzkaja i prywatnaja niezaležnaść i swaboda inicyjatywy ū halinie małačarskaj haspadarki. Bo ad Ziemlarobskaj Pałaty majuć być zaležnymi i rajony raźmiaščeńnia małačarskich pradpryjemstwaū. Słowam, heta maje być koncesyjanawany manapol na małačarstwa.

— U Waršawie 1.3.XI. siol. adbudziecca źjezd cocyjalohaū. Polski Instytut Socjolohičny zaprasiū na hety źjezd i Biełaruski Instytut Haspadarki i Kultury.

Z ZAHRANICY.

Wajna ū Afrycy. Abisyncy ūzmacniajucca: bolš milijona abisyncaū užo stalć na froncie. Abisyncy napadajuć na italijancaū u tyłoch italijanskaj armii ū Erytrei. Abisynskija žaūniery, z jakimi paddaūsia italijancam zdradnik Ras Guksa, uciakajuć ad italijancaū i ūstupajuć u abisynskuju armiju.

Chutka maje pačacca boj za miaścinu Gorahaj, adziny centr wady ū pustynnaj prawincyi Agaden. Biaz hetaha centru italijancy nia mohuć iści dalej uhłyb Abisynii.

Spadziajucca tam wialikaha boju, bo abisyncy hatowiacca mocna baranić hetaha rodnaha centru.

— Hazety padajuć, što Niamieččyna prapanuje Italii ekanamičnuju dapamohu, prociū sankcyjaū.

— Francuskaja presa piša: Italija hatowa ūžo mirycca z Abisynijaj na hetkich warunkach:—prawincyja Tihre z miestami Aksum i Adua — kab byli dałučany da italijanskaj kalonii ū Afrycy, jak aūtanomnaja obłaść pad uładaj abisynskaha zdradnika Guksy; nad prawincyjami Ogaden, Harrar i Dobkala, — Liha Narodaū kab dała mandat uładać Italii; apošniaja časć Abisynii — kab pierajšła pad uładu Lihi Narodaū, ale kab i tam Italija mieła ūsie prywilei — haspadarčyja, finansowyja i palityčnyja.

Słowam, ironija i tolki z boku Italii, a nia zhoda spynić pralićcio krywi.

— Negus — car Abisynii — zajawiū, što abisyncy buduć baranić swajej dziaržaūnaj niezaležnaści da apošniaha žaūniera i mocna wieryć u stojkaść Abisyncaū, što ad italijanskaha napadu abaroniacca i hetym razam pabjuć italijancaū, jak pabili ich 40 hadoū tamu.

Pahroza japonska - sawieckaj wajny. Hazety padajuć, što pradstaūnik japonskaha ministerstwa wajny zajawiū: — budziem pastupać rašuča prociū usialakich upływaū Sawietaū u Mandžury i i ū Paūnočnym Kitai. Nia spynimsia my i ad pahrozy wajny z Sawietami — zajaūlaje pradstaūnik Japonii.

Z hetaha bačym, što suadnosiny Japonii z Sawietami napružany.

Pamior Artur Henderson. U Londanie pamior staršynia mižnarodnaj konferencyi dziela razbrajeńnia, Artur Henderson.

Prad śmierciaj Henderson byū nahetulki asłabšy, što nia moh nawat i hazety čytać. Dahladčyki chworaha ab wajnie ū Afrycy Hendersonu ničoha nie kazali, kab jaho nie niepakoić; dyk Henderson i pamior, nia wiedajučy, što ū Afrycy wajna!

USIAČYNA

— Kala Stanisławowa (Uschodn. Haliččyna) Česłaū Zdanowič pasialiūsia na poli i pad adkrytym niebam načuje. Zdanowič pachodzić z Kijewa, służyū dabrawolcam u polskim wojsku, a ciapier nia maje ani pracy, anijakaj apieki.

— Na pabiarežžach Bałtyckaha mora ūžo wypaū śnieh. Polskaje Pamorje zasypana śnieham. Nad Bałtyckim moram praniesłasia bura, jakaja nahnała wady ū reki i pryčyniła hetak raźliū rekaū.

— Emihracyja ū Francyju spyniena. U hetym hodzie wiarnułasia z Francyi ū Polšč 21.587 asob

— Małpy wučacca ad ludziej wajskowych muštraū. U Abisynii zaūwažyli, što małpy z cikawaściaj pryhladalisia, jak žaūniery muštrawalisia z aružžam i paśla jany (małpy) hetaksama muštrawalisia z pałkami. Małpami kamandawała najbolšaja z ich, a ūsie jaje pakorna słuchali. Kali da ich padyjšli ludzi, jakija da hetaha pryhladalisia, małpy biez kamandy swajho „kamandziera" paūciakali na drewy.

Piśmo z wioski.

Zalesie, Sakolskaha pawietu. Našaja wioska maje kala 50 haspadaroū. U wioscy parachwijalny kaścioł i wołaść. U całaj našaj parachwii žywuć biełarusy kataliki. Ale tolki nia ūsie jašče razumiejuć, što jany biełarusy. Swaju biełaruskuju mowu jašče mnoha chto nazywaje „prostaju" i ūważaje jaje za horšuju ad inšych. Ale, dziakawać Bohu, hetak razumiejuć tolki durniejšyja ludzi i tyja, što chacia samyja durnyja, ale siabie ličać za „mudrych", bo byli łakajami abo parabkami ū panoū ci ksiandzoū; jany da čužoha caławieka haworać „papolsku", a ū chacie da siamji haworać pabiełarusku.

U našaj parachwii jość arhaniściuk. Jon syn niebahataha haspadara z našaj wioski. Pawučyūšysia niekalki miesiacaū ihrać na fartapijanie i ūžo siak tak na starych arhanach moža imšu adyhrać. Usio było-by dobra i piekna, kab jon sabie ihraū i nosa nie zadziraū, a to — śmiech ludziam kazać.

Da susiedziaū, brata i matki nia choča ūžo hawaryć tak, jak jaho matka nawučyła, nie šanuje swajej rodnaj biełaruskaj mowy dyj da hetaha jašče nadta złuje, kali susied abo susiedka adazwiecca da jaho jahonym imiem. Kaniešna, musiać usie nazywać jaho „panam arhanistym"!

Kali naš „Stefan", — kab nie zazławaū skažam „pan arhanisty", — pawioz z rodnym swaim bratam u Horadna pradawać jabłyki i kali brat pry ludziach nazywaū jaho Stefanam, dyk jon padwyšanym hołasam kryknuū: „nie nazywaj mnie Stefanem".

Woś bačycie, ludzi, jak chutka moža caławieku pierakrucicca ū haławie i pačnie nawat stydacca rodnaha brata i rodnaj matki. Ale, na ščaście, što taki ū nas — adzin na cału wiosku a moža i na parachwiju. Rešta dobryja ludzi, nia stydajucca swaich rodnych i swajej rodnaj mowy, čytajuć »Biełaruskuju Krynicu" i druhija biełaruskija hazety i robiacca świedamymi baraćbitami za swajo rodnaje.

A ciapier skažu trochi pra wybary ū Sojm, u našaj wołaści. Jany adbylisia padobna jak i ūsiudy. Hałasawała mienšaja častka.

Ahułam, chacia našaja wołaść niewialičkaja, ale hramadka dawoli wyrablenaja, znaje swaje prawy i abawiazki i nie dajecca nikomu wadzić siabie za nos, jak heta zdarajecca ū inšych wałaścioch.

Zalesianski.

KATALOH biełaruskich knižak na žadańnie wysyłajecca DARMA.
Adrasawać: Biełaruskaja Kniharnia «PAHONIA» Wilnia, Zawalnaja 1—1.

z ustanowaū ździejśniała wymohi pracy nad aświetaju ū darosłych. Adnyja z mahčymaściaū pracy praświetnaje byli wykarystany bolš, inšyja mienš, adnak daloka nia ūsie, jakimi siańnia wioska biełaruskaja mahła-b karystacca.

Daloka za nami tyja, nadta jašče niadaūnija, adnosiny da aświety, kali wioska hladzieła na jaje byccam na niešta „panskaje", swomaje adnoj tolki wyklučna panujučaj klasie, kali na't krytyčna i ironična hladzieła na „knižnych mudrahielaū". Siańnia nahladaje pieramienu ū henaj płoščy najbolš radykalnuju. Siańnia niama sceptykaū pamiž sialanstwam, kali idzie ab karyść aświety. Dakazywać patreby jaje, karysnaści mo' j nia treba było-b.

Sučasnyja ūmowy haspadarčyja nadta ciažkija. Trudna hadać, ci siańniašni kryzys — źjawišča pierachodnaje, ci astaniecca jon nam nadoūha ū formie pieramieny suadnosinaū dziaržawy-hramadzianstwa. Adno zusim biazsumliūnaje, što ūmowy žyćcia buduć štoraz bolš zabłytanymi, što treba štoraz wialikšaje natuhi, kab zdabyć chleb. Konkurencyja štoraz wialikšaja i tolki najlepš azbrojenaja adzinka najchutčej i najlahčej umiecimie razdabyć sabie heny chleb. Henym mahutnym aružžam u rukach kožnaha caławieka, niezaležna ad jahonaje prafesii, budzie aświeta.

Nia kožny razumny z wialikaju aświetaju caławiek maje paśpiech u žyćci... Inšamu nia ładzicca zaūsiody, jak kažam my, „nie šancuje".

Bačym uznoū ludziej biez aświety, a jakija ūmiejuć usieńka prawiaści, jakija bahaciejuć, dy na't pyšajucca, što nia čytajuć knižak nikoli.

Usieńka heta mahčyma, tolki heta adnak wyniatki. Heta pakazywaje nam na adno, što aświeta jašče nia ūsieńka dziela wartaści caławieka. Patrebnyja jašče inšyja swomaści, kab caławiek byū personaju, kab pakinuū śled pa sabie,—treba, kab heny caławiek mieū charaktar. Pakiniem na staranie sprawu charaktaru, jana nia złučana stulna z prablemaju aświety, ab čym hetta jdzie ū nas hutarka.

Narmalna tady idzie poruč z aświetaju zamožnaść; poruč z ciemraju, adsutnaściu kultury — idzie hrašowaja halita. Nahladajem heta ū žyćci adzinak, siemjaū, wialikich narodaū i dziaržawaū. Charakternyja prykłady procileżnych sytuacyjaū mahli my ahladać u dawajennaj, prykładam, Rasiei i Šwajcaryi ci Danii.

U Rasiei nia hledziačy na wializarnyja bahaćci naturalnyja ekanamičnyja, nia hledziačy na šmatmilijonnaje žycharstwa dziaržawy, źjawišča hoładu ū całych hubernijach było zusim narmalnym. Ab hetym usie wiedali i nichto nia dziwiūsia. Pobač z hetym adciemim, što Rasieja dawajennaja mieła kala 60 prac. niahramatnych ludziej.

A ciapier—Šwajcaryja, dzie na 3 milijony žycharoū było 6 uniwersytetaū, dzie na wioskach byli himnazii, dzie wiaskowyja chaty mieli ūžo da wajny elektryku, dzie amal nia kožnaja wioska mieła swajo adhalinieńnie elektryčnaha tramwaju ci elektryčnaje čyhunki. Adnačasna z hetym analfabetaū-biazhramatnych nia było zusim.

Supastaūleńnie henaje wielmi šmat haworyć.

Statystyčnyja cyfry mohuć z wialikaju siłaju da nas źwiartacca. Hlaniem na paru cyfraū, jakija pakazywajuć na inšuju halinu dziejańnia aświety, mianoūna ū płoščy taho, što zawiem moralllu.

Ciemra, halita duchowaja duša biazlitasna caławieka. Adzinka i hramada nia mohuć wyjści z zababonaū, prymityūnych adnosinaū da ūsich źjawiščaū, caławiek taki nia ūmieje raźwiazać krychu bolš zabłytanych adnosinaū i płocić za heta ščaściem asabistym, paśpiecham žyććiowym. U toj samaj Rasiei poūna wiaźnicaū i adnosnaja ich pracentnaja kolkaść mahła-b napałochać wielmi wialikich optymistych. Paasobnyja krainy taje samaje dziaržawy z nieadnolkawym roūniem aświety i kultury i adnačasna roznaju kolkaściu prastupnikaū, wiaźnicaū haworać nam krasamoūna ab uzajemnych adnosinach henych dźwioch katehoryjaū źjawiščaū (paūnočnyja i paūdzionnyja prawincyi Italii i Hišpanii).

Kantrola cyfraū pazycyi ū budžecie na aświetu i na palicyju pakazwaje, što čym mienšyja cyfry iduć na aświetu, tym bolšyja na palicyju, sudy. I kali dziaržawa rabiła sproby pieramianić henyja suadnosiny (Anhlija), dajučy bolš na škołu, na aświetu, adnačasna mienšała kolkaść prastupkaū.

Dyk paśpiech adzinak, supakoj, ład i prawaparadak u žyćci hramadzkim, dziaržaūnym zaležać ad roūnia aświety.

Aświeta daje adnačasna mahčymaść pabolšyć tuju kryšku ščaścia, da jakoje imkniecca caławiek. Aświeta pawialičywaje naš kruhazor, adčyniaje wočy na biazlikaje mnostwa źjawiščaū, pracesaū, kala jakich caławiek biez aświety prachodzić moūčki. Aświeta nie daje zasnuć, jana warušyć u siaredzinie, kab nie stajać, nie lanawacca, jana miž inšym wučyć lepš razumieć nas unutrany hołas—sumleńnie.

Nie adzin mo' bywała narakaū na aświetu, što pryščapiła jana jamu hoład praūdy i patrebu jaje, što „adabrała jana jamu spakoj dumkam jahonym,"... adnak nia choča jon užo kinuć i wiarnucca da taje pary, kali byū ślapy i hłuchi, kali žyćcio ciakło kala jaho a jon sonna, zaśmiahšy stahnaū i myčaū, byccam nierazumnaja žywioła.

* * *

Woś dzieła čaho nam treba bracca za aświetnuju rabotu, woś što pawinna ūlić kožnamu pracaūniku ahoń u hrudzi, kali jon maje mahčymaść razharnuć pracu nia tolki kala siebie a i pamahčy druhim.

№6(17). СТУДЭНЦКАЯ ТРЫБУНА. 3.XI.35.

Да працы!

З тае пары, як рыскі трактат падзяліў Беларусь на часткі, беларуская студэнцтва ў Зах. Беларусі было падзелена на два або і тры абозы, якія між сабой змагаліся. Ішло на гэта шмат сілаў і энэргіі, а ворагі беларускага народу гэты падзел падтрымоўвалі. Заўсёды, аднак, перамагалі народнікі — незалежнікі. Сягоньня, дзякуючы цяжкаму палажэньню беларускага народу, амаль усё беларускае студэнцтва зразумела, што толькі вера ў свае ўласныя сілы, праца ў народзе і для народу зьдзейсьняць ягоныя палітычна-грамадзкія ідэалы.

Рэч ясная, што супрацоўнічаць з студэнцтвам іншых народаў, якія ёсьць у падобных да бел. народу абставінах ніколі ніхто не адмовіцца, бо гэта толькі ўзмоцніць з вонку нашу працу.

На жаль ёсьць яшчэ і паміж беларускімі студэнтамі слабавольныя адзінкі, якія спакушаныя „мамонай» і абяцанкамі хочуць здабываць шчасьце свайму народу падлізьніцтвам і сэрвілізмам. Іх клічам ёсьць:

„Наперад, наперад! пакорна сагнуўшы сьпіну." (словы з верша С. Сарокі). Слаба пойдзем наперад сагнуўшы, ды яшчэ пакорна сьпіну!

Нельга тут памінуць і так зв. „радыкалаў," якія вялі больш дэструкцыйную працу, чымся пазытыўна-творчую.

Але ў апошнім часе яны зусім разьбіліся.

У якім духу працуе беларуская студэнцкая моладзь, няхай пасьведчаць факты з жыцьця Беларускага Студэнцкага Саюзу ў Вільні, арганізацыі, якая гуртуе ў сабе большасьць беларускага студэнцтва.

Дня 19.X.35 г. адбыўся у залі Беларускага Інстытуту Гасп. і Культуры інаўгурацыйны вечар Б.С.С., на якім старшыня Саюзу кал. М. Шчорс прывітаў прысутных наступнымі славамі:

„Калежанкі і калегі!

Распачынаецца новы акадэмічны год — год інтэнсыўнае працы над здабываньнем веды, працы над пашырэньнем свайго інтэлектуальнага кругавіду. Гэта ёсьць наш абавязак перад самым сабой. Апрача гэтага абавязку асабістага на нас ляжыць абавязак вышэйшы: абавязак працы для свайго Народу, для сваей шматпакутнай Бацькаўшчыны. *Працуючы на ўнівэрсытэце, мусім прырыхтавацца* да канкрэтнай народна-грамадзкай працы, да працы над палепшаньнем долі нашага народу. У час прабываньня на студыях, мы, будучая інтэлектуальная сіла народу, павінны таксама вырабляцца пад паглядам грамадзкім, бо кожны з нас можа быць пакліканым да выконываньня грамадзкіх абавязкаў. А гдзе лепш можам вырабіцца пад гэтым паглядам — набраць рутыны, калі не ў арганізацыях і то арганізацыях нечужацкіх. Не эндэцкія, не санацыйныя „мысьлі моцарствовыя" з аднаго боку, а „Легіёны младых" з другога, не Związek Polskiej Młodzieży Demokratycznej, ani Z. P. Mł. Socjalistycznej, кідаючыя псэўдабратнія клічы павінны зьяўляцца полям працы для беларускага студэнцтва, а толькі цьвёрда абапёртая на грунце нацыянальным, зьвязаная са сваім народам, свая ўласная арганізацыя, якая ўсіх нас лучыць у адну вялікую сям'ю для працы над сабой і для дабра Бацькаўшчыны.

Усім гэтым вымогам у 100°/° адказывае Б.С.С. Тут выконываецца сьветапагляд, тут гартуецца сталёвы характар, каб сьмела стаць пад бел-чырвона-белы сьцяг і распачаць у народзе працу ад нізоў.

Канчаючы сваё кароткае ўступнае слова, заклікаю ўсіх калежанак і калег да сумленнага выконываньня сваіх абавязкаў. Хай у 16 годзе свайго існаваньня запульсуе жыцьцём, як ніколі, наш родны Б.С.С.!"

Пасьля уступнага слова старшыні Саюзу, кал. П. Засім выступіў з рэфэратам на тэму: „Беларускі студэнт і вёска," распачынаючы ад слоў украінскага поэта І. Франко: „Народзе мой! забіты, замучаны на крыжаваных дарогах стаіш ты, як паралітык разьбіты." Далей прамоўца ў яркіх словах даў страшны вобраз эканамічнага быту беларускага селяніна і работніка і іх трагічныя перажываньні маральныя. Наступна кал. З. прадставіў прыродныя багацьці нашага краю і магчымасьці разьвіцьця промыслу на Беларусі, а паіменна: — цукраварняў, бровараў, фабрык сернікаў, ткацкіх і іншых. На заканчэньне прамоўца горача заахвочываў прысутных грунтоўна пазнаваць прыродныя багацьці нашага краю, бо гэта ёсьць фундамэнт нашай адраджэнскай працы і гэтага ад беларускага студэнта дамагаецца селянін і работнік.

Бачымо з гэтага, што бел. студэнцкая моладзь стаіць на цьвёрдым народніцкім грунце і творыць шчыльныя рады, каб пайсьці ў народ і распачаць там працу.

Дык дружна, Калежанкі і Калегі, да працы для дабра Бацькаўшчыны.

Я. М.

Праўда перамагае.

Даведваемся, што архіепіскап Хвядос выдаў загад, каб у школах на тэрыторыі Віленскай Эпархіі навучалі праваслаўных дзяцей Закону Божага ў іх матчынай мове— беларускай. Беларуская студэнцкая моладзь ня раз дамагалася правоў роднае мовы ў царкве. І, як мы бачым, наша думка ёсьць на дарозе да зьдзейсьненьня. Прэасьвяшчэньнейшы Архіепіскап Хвядос пераканаўся, што Крыніцы Праўды Хрыстовай можна ўліць у душу нашай моладзі толькі цераз навучаньне Закону Божага ў роднай мове беларускай. Мы, праваслаўная моладзь, шчыра вітаем прыхільнасьць Уладыкі да рэлігійных патрэб беларускага народу. Аднача сна вітаем пастанову Віленскай Праваслаўнай Кансысторыі, каб пропаведзі ў цэрквах Віленскай Эпархіі гаварыліся пабеларуску, і спадзяёмся, што гэтым разам пастанова Кансысторыі будзе зрэалізавана. Няхай-жа загад Віленскага Уладыкі і пастанова Кансысторыі гулкім рэхам адаб'юцца ў шырокіх слаёх беларускага грамадзянства і будуць прыкладам для іншых эпархіяў на беларускіх землях.

См. Мах.

Дапамогі.

Таварыства Прыяцеляў Студэнцкай Моладзі („Towarzystwo Przyjaciół Młodzieży Akademickiej") вызначыла як дапамогу акадэміцкай моладзі віленскага унівэрсытэту 82,535 зл. З гэтай сумы хрысьціяне атрымалі 66,265 зл., а жыды 15.270 зл.

Цікава, што беларусы, украінцы, літоўцы і расейцы атрымалі разам 1000 зл.: па 250 зл. на саюз, а жыдоўскі Акадэміцкі Клюб Спартовы атрымаў 1100 зл.

Варта адцеміць, што з выданых грошаў на санітарна-лекарскія патрэбы акад. моладзі пайшло 37000 зл., а на спартовыя 6100. З гэтага відаць, што бяз грошаў, дык і гімнастыкі рабіць ня можна, — што студэнту на большую карысьць выйдзе пагімнастыкавацца, чымся зьесьці абед, або ўпару аплаціць квэстуру!!

Студэнты на вёсцы

Беларускія студэнты Зах. Беларусі правялі сёлетняе лета пад клічам: асьвета для вёскі. У многіх мяйсцох адбываліся рэфэраты, дыскусіі і былі ладжаныя прадстаўленьні з народнымі гульнямі. Трэба адцеміць, што адносіны паліцыі былі амаль усюды аднолькавы: паліцыя ўсюды рупілася даглядзець „porządku publicznego." Дзе мелася адбыцца беларуская імпрэза, паліцыя мерала тое памешчаньне і калі не хапала прадпісанай меры, тады заяўляла —„ня можна." Калі-ж будынак быў вялікі, тады йшлі да гаспадара будынку і дакладна яго распытывалі: хто ён, сколькі мае гадоў, як звалі яго бацьку, матку, ці караны судом, ці жанаты, сколькі мае дзяцей і г. д.

Народ, асабліва моладзь, надта ахвотна горнецца да асьветы ў роднай мове. Народныя масы ўжо ведаюць, што яны беларусы і хочаць актыўна браць удзел у беларускім руху. Словам, мы магутнеем!

г.

Палітыка ў царкоўна-касьцельным жыцьці.

Голас на балонках нашага часапісу аб езуіцкай ўнійнай дзейнасьці на нашых землях („Ст. Тр." з дня 28.І.35 г.) меў водгук. Айцы езуіты на гэта моцна зарэагавалі. Фактам таксама ёсьць, што з дубенскай духоўнай сэмінарыі амаль палавіна беларусаў выступіла!..

—о—

У першых днях сёлетняга школьнага году ўлады Віленскай Каталіцкай Духоўнай Сэмінарыі без паданьня прычын выкінулі з Сэмінарыі клерыка беларуса В. Папуцэвіча; пры гэтым радзілі кал. П., каб перавёўся ў Ломжынскую Духоўную Сэмінарыю. Клерыку беларусу няма, значыцца, месца ў Вільні, а ёсьць яно ў Ломжы?!!

Хроніка.

Акадэмічны год пачаўся. Акадэмічны год на віленскім унівэрсытэце нармальна распачаўся 15 кастрычніка. У гэтым годзе даволі многа студэнтаў беларусаў уступіла ў віленскі ўнівэрсытэт. Паводле сьпісу студэнтаў, у прошлым 1934-35 г. на унівэрсытэце ў Вільні было больш 100 студэнтаў беларусаў.

Інаўгурацыйны вечар. У суботу 19 кастрычніка, у памешканьні БІГіК, Беларускі Студэнцкі Саюз зладзіў інаўгурацыйны вечар з наступнай праграмай: 1) уступнае слова — якое сказаў старшыня Саюзу кал. Шчорс М., горача заклікаючы сяброў да працы для дабра беларускага народу, 2) рэфэрат — прачытаны кал. П. Засімам на тэму: „Беларускі студэнт і вёска" і 3) скокі. Агульнае ўражаньне з вечару вельмі добрае.

„Гісторыя Клецкай Гімназіі. У суботу 27 кастрычніка г. г. у памешканьні Саюзу быў прачытаны сябрам Саюзу кал. У. Казаком рэфэрат на тэму: „Гісторыя Клецкай Беларускай Гімназіі" ад часу яе заснаваньня аж да закрыцьця польскімі ўладамі. Кал. Казак будучы сам гадунцом Клецкай Гімназіі прадставіў цікавую гісторыю яе разьвіцьця і саматужную поўную ахвярнасьці працу вучыцялёў і вучняў гімназіі і асабліва падчыркнуў прэлегэнт ахвярнасьць грам. Якубёнка. Слаба была прадстаўлена ўнутрана-арганізацыйная старана гімназіі.

Дыскусыйны вечар. У суботу 2 лістапада ў памешканьні Саюзу адбудзецца дыскусыйны вечар над апошнім нумарам студэнцкага часапісу „Студэнцкая Думка". Вечар ладзіць БСС. Пачатак а гадз. 19.

Запазнаўчая гарбатка ў БСС У суботу 9 лістапада Бел. Студ Саюз ладзіць „Сяброўскую Гарбатку".

XV угодкі Беларускага Студ. Саюзу. Урад БСС на апошнім з сваіх паседжаньняў пастанавіў зладзіць у канцы месяца лістапада г. г. урачыстае сьвяткаваньне XV-тых угодкаў існаваньня Бел. Студ. Саюзу. На праграму складаюцца рэфэраты ідэолёгічнага і інфармацыйнага зьместу, сьпевы хору пад кіраўніцтвам грам. Р. Шырмы, дэкламацыі. Апрача таго, сьвяткаваньне XV-тых угодкаў Саюзу будзе спалучана з выстаўкай прэсы Бел. Студ. Саюзу і мастацкіх твораў сяброў Саюзу.

Скончылі унівэрсытэт. Сёлета ў пачатку 1935-36 акадэміцкага году скончылі унівэрсытэцкія навукі мэдыцынскага факультэту і здалі ўсе патрэбныя экзамены сябры Беларускага Студэнцкага Саюзу кал. Фэрдынанд Леўша і кал. Язэп Малецкі.

Маладых беларускіх лекараў шчыра вітаем і выражаем, ім пажаданьні карыснай працы для дабра беларускага народу.

Др. Леўша цяпер адбывае вайсковую павіннасьць, а др. Малецкі практыкуе ў віленскіх шпіталях.

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт. У сталіцы Беларусі — ў Менску заснаваны унівэрсытэт у 1923 годзе. Гэты унівэрсытэт афіцыяльна называецца — Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, у скарочаньні — БДУ.

У Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце цяпер вучыцца 1104 студэнтаў. Пры БДУ ёсьць дзенны і вячэрні рабочы факультэты з агульным лікам 924 слухачоў.

У Менску ёсьць так-жа Беларускі Дзяржаўны Мэдыцынскі Інстытут, які мае 2260 студэнтаў.

— Вышэйшы Пэдагогічны Інстытут, які мае 1022 студэнтаў.

— Інстытут Народнай Гаспадаркі, які мае 1103 студэнтаў.

— Інстытут права, які мае 460 студэнтаў.

30-лецьце творчасьці Янкі Купалы. Сёлета мінае 30 гадоў літаратурнай творчасьці беларускага народнага паэта Янкі Купалы.

У Менску яшчэ вясной адбыліся адпаведныя з гэтай прычыны ўрачыстасьці, а цяпер утварыўся там адумысловы камітэт, дзеля ўшанаваньня юбілею нашага паэты. У Камітэт уваходзіць: Чарнушэвіч, Ляўкоў, Дзякаў, Клімковіч, Якуб Колас, Кавальчук, Жуковіч, Горын, Александровіч, Стукалаў і Кульбак.

Першы зьезд т-ва „Спартак." У Б.СС.Р. ёссць спартовая арганізацыя „Спартак," якая сёлета 10 лістапада ладзіць агульны зьезд сваіх сяброў. Т-ва „Спартак" мае свае аддзелы ва ўсіх большых местах Савецкай Беларусі і адусюль маюць прыбыць на зьезд дэлегаты т-ва.

Колектывізуюць беларускую вёску. Неахвотна беларускія сяляне йдуць у колектывы, але камуністы на гэта не зважаюць і далей заводзяць калгасы у Беларусі. Ужо сколектывізавана 85,3 проц. усіх гаспадарак — ужо зарганізавана ў Сав. Беларусі 10.877 калгасаў. З гэтым фактам прыдзецца лічыцца і ў будучыне...

Беларускі Адрыўны Календар на 1936 год
ужо выйшаў з друку і прадаецца ўсюды!
Цана аднаго экзэмпляра 50 грошаў.
Хто купляе большы лік, атрымлівае зьніжку.
Зьмест календара багаты і размавіты.
Галоўны склад у: Бел. Кнігарні „Пагоня", Вільня, Завальная вул. 1.

Рэдакцыйная Калегія «Студэнскай Трыбуны» ў складзе: А. Дасюкевіч, М. Смаршчок, А. Махонька, С. Нарушэвіч і М. Канцэлярчык.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič